Роман пронизан гротеском космических масштабов. Ирония – основной пафос «Улисса». Смех автора в какой-то мере является инфернальным. Он нарастает постепенно. Первая часть «Улисса» еще серьезна. Во второй Джойс почти все подвергает испытанию смехом. И не жалеет самого себя – самоирония здесь очевидна.

Внешняя и внутренняя композиция романа – многоплановая и полифоничная. Основная мифологема джойсовского хаокосмоса – возвращение.

**Литература**


1. *Eco U.* The Aesthetics of Chaosmos. The Middle Ages of James Joyce. Harvard University Press / Cambridge / Massachusetts, 1989. 96 с.
2. *Хоружий С. С.* «Улисс» в русском зеркале // Джойс Дж. Избранное в 2-х т. Т. 2. М., Терра, 1997. 560 с.
3. *Затонский Д. В.* Модернизм и постмодернизм. Мысли об извечном коловращении изящных и неизящных искусств. Харьков: Фолио, М., АСТ, 2000. 256 с.


## РЫТОРЫКА-МЕТАДЫЧНЫЯ АСНОВЫ НАВУЧАННЯ ІНТАНАЦЫЙНЫМ СРОДКАМ МАЎЛЕННЯ

**А. П. Літвінава**

Перад сучаснай адукацыяй стаяць адвечныя пытанні: «Якімі павінны быць маладыя людзі – выпускнікі школ? Як ім не згубіцца ў лабірынтах сучаснага жыцця? Як знайсці сваё месца ў грамадстве?» Такія пытанні паўстаюць перад школай XXI ст., якому патрэбны чалавек, здольны дакладна і лагічна разважаць, правільна і прыгожа размаўляць.

Вядомы афарызм: «Значна не толькі тое, *што* гаворыцца, але і тое, *як* гаворыцца», – застаецца надзённым і сёння. Ва ўмовах сучаснага хуткаплыннага росту інфармацыі істотнай бачыцца праблема аптымальнай перадачы зместу выказвання. У немалой ступені гэта забяспечваецца інтанацыяй, якая выконвае сэнсаадрозную функцыю.

Аднак нельга забываць, што інтанацыя – той «галасавы скарб», які можа ўнесці паэзію, музыку, эмацыянальнае багацце ў нашае маўленне, што дазваляе нам не толькі скласці аб сабе добрае ўражанне, але і падтрымаць, натхніць чалавека словам.

Таму невыпадкова новай праграмай па беларускай мове ў 10–11 класах школы прадугледжана праца над сістэматызацыяй і абагульненнем ведаў аб інтанацыйных сродках выказвання і развіццём умення выкарыстоўваць іх пры вусных зносінах.

Як актуальная паўстае задача вызначэння напрамкаў метадычнай дзейнасці па ўдасканаленні маўлення старшых школьнікаў у тэхніка-выканаўчым аспекце.

З улікам рэкамендацый вядомых навукоўцаў-метадыстаў Л. А. Увядзенскай, Д. Х. Вагапавай, А. А. Каляды, В. Ф. Русецкага, А. А. Шагідзевіч і інш., а таксама ўласнага педагагічнага вопыту вылучым некаторыя асноўныя падыходы да ўдасканалення інтанацыйнага афармлення вуснага выказвання.

**1. Комплекснае навучанне выразнай інтанацыі як сінтэтычнаму феномену праз адпрацоўку яе асобных элементаў**

Так, яшчэ на этапе тэарэтычнага разгляду матэрыялу мэтазгодным з'яўляецца складанне апорнай логіка-структурнай схемы, якая дэманструе сувязь абраных для засваення тэрміналагічных адзінак з ключавым паняццем інтанацыі. Праца над схемай развівае аналітычныя здольнасці школьнікаў і вызначае шляхі далейшай практычнай навучальнай дзейнасці.

**2. Навучанне інтанацыйнаму афармленню выказвання ў агульным сістэмным кантэксце працы над тэхнікай маўлення**

У прыватнасці, вучні павінны ўсвядоміць, што выразная, нязмушаная інтанацыя залежыць ад правільна арганізаванага дыхання. У гэтым упэўнівае трэніровачнае чытанне вершаў з працяглай даўжынёй радка (напрыклад, фрагментаў «Песні пра зубра» М. Гусоўскага): велічнае, урачыстае расповеднае гучанне дасягаецца за кошт роўнага, размеркаванага выдыху.

**3. Спалучэнне рацыянальна-лагічнага і псіхалагічна-эмацыйнага бакоў у працы над інтанацыяй**

Раскрыць і скарыстаць сакрэты выразнага маўлення, сакрэты яго ўздеяння на слухачоў дазваляе наданне выказванню эмацыйнай, псіхалагічнай афарбоўкі, а перадаць змест выказвання – правільнае рытміка-меладычнае чляненне маўленчай плыні. Таму мэтазгоднай з'яўляецца праца над паўзацыяй і акцэнтуацыяй. Ужываюцца сказы, якія ілюструюць залежнасць сэнсу ад змены месца лагічнай паўзы ў фразе: *Чужым тэлефонам карыстацца забаранялася; На прыпынку стаялі мужчына і жанчына з дзецьмі; Фірма паведамляе аб атрыманні карэспандэнцыі з вялікім спазненнем.* Прапануюцца практыкаванні, якія дэманструюць сэнсаадрозную прыроду націску:

- падбор варыянтных адказаў на пытанні, якія агучваюцца з перамяшчэннем інтанацыйнага цэнтра ад аднаго слова да другога: *Мы сустракаемся заўтра на выставе?*;

• дадумванне працягаў фразы з антытэзамі, якія залежаць ад яе сэнсу, што канкрэтызуецца лагічным націскам;

• трэніроўка ў агучванні скарагаворак з розным лагічным націскам.

Развіццё ўменняў інтанаваць выказванне згодна з патрабаваннямі розуму і пачуццяў магчыма пры чытанні прыказак і прымавак з пэўным экспрэсіўным зарадам. Колькасць эмацыйна-экспрэсіўных значэнняў бязмежна. Як вядома, яшчэ К. С. Станіслаўскі казаў пра 40 сітуацый, якія ствараюцца living рознымі інтанацыйнымі варыянтамі словазлучэння *сёння ўвечары*, Б. Шоу – пра 50 спосабаў вымаўлення слова *так* і 500 спосабаў для слова *не*. У тым, што інтанацыя выконвае эмацыйна-экспрэсіўную функцыю, вучні ўпэўніваюцца пры чытанні прыказак і прымавак у прапанаваных танальнасцях. Напрыклад, прыказку *Языком у Вільні, а галавой за печчу* прапануецца вымавіць: а) здзіўлена; б) расчаравана; в) высакамерна; г) жартоўна.

Перспектыўным уяўляецца выкарыстанне розных варыянтаў такога роду практыкавання:

• вызначэнне агульнай тэмы і прыдатнай інтанацыйнай афарбоўкі прыведзеных прыказак, да прыкладу: *Без мукі няма навукі*; *Добра вучыць паслухмянага*; *Што жывем, то вучымся*;

• самастойны падбор магчымых інтанацыйных танальнасцей для выканання адной і той жа прыказкі;

• падбор прыказкавых адзінак да прыведзеных рускіх адпаведнікаў і іх інтанаванне.

**4. Праца над інтанацыйным афармленнем выказвання ў імпрэсіўным і экспрэсіўным аспектах**

Напрыклад, падвойным чынам выкарыстоўваюцца сказы з мастацкіх твораў, якія змяшчаюць простае маўленне і падаюцца ў слоўніку эпітэтаў М. П. Пазнякова ў якасці ілюстрацый да назоўнікаў *голас*, *тон*. Зразумець аўтарскую думку – значыць даць пры чытанні ўслых належнае паўзаванне і акцэнтаванне, надаць ёй экспрэсіўную афарбоўку. Навучэнцы па чарзе спрабуюць з максімальнай выразнасцю выканаць рэплікі, каб іх аднакласнікі пасля гэтага змаглі самастойна даць адпаведную аўтарскай характарыстыку гучання. Пры аналізе агучанага тэксту школьнікі супастаўляюць зададзеную аўтарам інтанацыю з рэальнай інтанацыяй пачутых рэплік і такім чынам ацэньваюць ступень экспрэсіўнасці выканання. Такі від практыкавання быў з поспехам выкарыстаны ў СШ № 4 г. Мінска.

**5. Узаемасувязь працы над інтанаваннем з лінгвістычным аналізам маўленчага матэрыялу**

Рытміка і мелодыка тэксту не з'яўляюцца чымсьці выпадковым, цалкам залежным ад экстралінгвістычных умоў і асобасных якасцей моўцы, а вызначаюцца шэрагам лінгвістычных фактараў: лексікай тэксту; ужытымі граматычнымі канструкцыямі; парадкам слоў і актуальным чляненнем.

Так, істотнай бачыцца трэніроўка ў меладычнай і танічнай апрацоўцы выказвання з улікам патэнцыяльных магчымасцей пісьмовага тэксту. Калі ў наступных сказах не паставіць у канцы знак прыпынку, то іх сэнс не будзе зразумелым, бо тут магчыма інтанацыя, якая выражае пытанне, сцвярджэнне, незавершанасць: *Мне ніхто не тэлефанаваў*, *Сёння не вельмі халодна*, *Ты ўчора вярнуўся позна.*

**6. Выкарыстанне аўдыёапаратурнай фіксацыі маўлення пры аналізе жывой гутарковай мовы**

Гэта дазваляе развіваць слыхавую памяць, уменні ўважлівага аналізу і самакантролю негатыўных і станоўчых інтанацыйных якасцей вуснага выказвання. Для аналізу можна выкарыстаць тэксты, якія былі прачытаны дыктарамі радыё і тэлебачання, журналістамі, акторамі, а таксама тэксты вучнёўскага (чужога і ўласнага) выканання.

**7. Узаемасувязь удасканалення інтанацыйнага афармлення з заняткамі па музычным мастацтвем**

Так, па ўражаннях ад праслухвання аднолькавых музычных твораў у розным выкананні навучэнцы робяць параўнанне спявацкіх манер з пункту гледжання тых якасцей інтанацыі, якія адметна выяўлены. Пасля гэтага самімі школьнікамі чытаюцца адпаведныя тэкставыя ўрыўкі без музычнага суправаджэння з дасягненнем пажаданых танальных якасцей. Можа праводзіцца інтанаванне варыятыўных гукавысотных контураў як меладэкламацыя з мэтай пашырэння высотнага і дынамічнага дыяпазону гучання і авалодвання перспектывай размеркавання вышыні голасу. Такі міжпрадметны падыход мае асаблівую карысць ў школах з музычным ухілам і пры апрабаванні выклікаў цікавасць у старшакласнікаў СШ № 4 г. Мінска, дзе рэалізуецца адпаведны кірунак дыферэнцыяцыі навучання.

Прапанаваныя канцэптуальныя асновы метадычнай дзейнасці робяць працу над інтанацыйным афармленнем выказвання больш мэтанакіраванай і свядомай, спрыяюць удасканаленню вуснага маўлення, што дазваляе старшакласнікам убачыць сябе ў «маўленчым люстэрцы»,

усвядоміць месца рыторыкі ў сістэме свайго асобаснага развіцця і яе ролю як мастацтва ў грамадстве.

## СВЯДОМАЕ ПЕРААДОЛЕННЕ СТРАХУ ЯК ЭЛЕМЕНТ СВЕТАПОГЛЯДУ СТАРАЖЫТНЫХ СЛАВЯН

**Т. У. Мураўёва**

У свеце чалавечых эмоцый страх – з'ява настолькі распаўсюджаная і мае так многа адценняў, што цяжкай з'яўляецца не толькі спроба яго тлумачэння, але нават спроба яго рацыянальнай класіфікацыі. Страх – рэальная частка нашага жыцця. Чалавек можа перажываць страх у самых розных абставінах, але ўсе яны маюць адну агульную рысу: яны ўспрымаюцца чалавекам як пагроза для яго спакою і бяспекі. Даволі часта страх класіфікуюць як адмоўную эмоцыю, якая атручвае арганізм чалавека, нібы таксін. Такое стаўленне да страху можна растлумачыць тым, што вялікая колькасць людзей баіцца не прычын, якія выклікаюць страх, а самой эмоцыі. Чалавек забывае, што гэтую эмоцыю, калі яна не выходзіць за межы разумнага і суадносіцца з сітуацыяй, неабходна разглядаць не як адмоўную і жахлівую, а як неабходную для выжывання ў навакольным асяроддзі. Страх – гэта адна з праяў інстынкту самазахавання. У спадчыну ад продкаў чалавек атрымаў набор пэўных якасцей і эмоцый, якія дазваляюць яму вызначыць сваё стаўленне да свету і прыстасавацца да яго. Багацце форм паводзін схематычна можна абазначыць праз два вектары: «да» і «ад» навакольнага свету. Суб'ектыўным карэлятам руху «да» навакольнага свету можна вызначыць такія пазітыўныя пачуцці як сімпатыя, сяброўства, каханне і г. д., а карэлятам супрацьлеглага накірунку – такія негатыўныя пачуцці, як страх, нянавісць, варожасць і г.д. Неабходна адзначыць, што вызначэнне страху як эмоцыі негатыўнай не адмаўляе неабходнасці дадзенай эмоцыі ў свеце чалавечых перажыванняў. Усё залежыць ад адносін індывіда да ўласнага страху. Негатыўнасць страху ў тым, што, ахопліваючы чалавека, ён пачынае кіраваць ім і можа стаць прычынай дэградацыі. Аднак гэтая з'ява амбівалентна, таму што пераадоленне ўласнага страху – гэта крок на шляху эвалюцыі. Як бачым, мы зноў вяртаемся да высновы: чалавек павінен умець кіраваць уласным страхам.

Кожны чалавек у сваёй свядомасці стварае сваю суб'ектыўную «мадэль свету». Яна залежыць ад характару адносін чалавека да з'яў рэчаіснасці. «Мадэль свету» ў ідэальным варыянце павінна мець магчымасці для пашырэнне сваіх межаў, шляхам павелічэння ведаў пра навакольны свет. Аднак павелічэнне ведаў заўсёды было звязана з